*А.М.МАКАРЭВІЧ*

# СЭНС І СТРУКТУРА МАСТАЦКАГА ВОБРАЗА Ў АПАВЯДАННЯХ В.ЛАСТОЎСКАГА

Аўтары беларускай прозы XIX – пач. XX стст. даволі часта звярталіся да асэнсавання філасофскіх пытанняў. Можна выдзеліць *тры асноўныя праблемныя кірункі* філасофскага зместу ў беларускім апавяданні гэтага перыяду: а) мастацкае асэнсаванне эстэтычных пытанняў; б) мастацкае асвятленне праблемы светаўладкавання і жыцця чалавека ў Сусвеце; в) вырашэнне праблем сацыяльна-філасофскага зместу з выразна нацыянальнай афарбоўкай.

У творах Я.Коласа, М.Гарэцкага, В.Ластоўскага, М.Багдановіча ўзаемадапаўняльнымі з'яўляюцца сэнсавыя плыні ў рэчышчы асвятлення вышэйшых законаў светаўладкавання і жыцця чалавека ў адпаведнасці з імі альбо супраць іх. Што ёсць пачаткам у Свеце, што кіруе жыццём і існаваннем у ім, што наканавана спрабуе супрацьстаяць вышэйшым вызначаным прынцыпам арганізацыі чалавечага жыцця, што ёсць за зямной прасторай, "адкуль яно ўсё?, "і чаму яно ўсё?", "і што яно?" – вось галоўныя пытанні праблемнага характару, якія стаяць у цэнтры філасофскай малой прозы названых аўтараў. Паказальнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца апавяданні В.Ластоўскага "Нарадзіны", "Мары", М.Гарэцкага "Што яно?", Я.Коласа "Чортаў камень", "Чыя праўда?", М.Багдановіча "Шаман", "Калейдоскоп жизни" і інш.

Звернемся да разгляду структуры мастацкага вобраза ў апавяданнях В.Ластоўскага, у якіх адбываецца асвятленне праблемы законаў светаўладкавання і жыцця чалавека па гэтых, вышэйшай Сілай прадвызначаных законах.

У цэнтр сусветнага ўладкавання В.Ластоўскім ставіцца Кон (апавяданні "Нарадзіны", "Мары"), які прадвызначае шляхі існавання матэрыяльнага і духоўнага ў ім. Кон з'яўляецца "прычынай усякага быту"[1]. Ён жа дае чалавеку і Долю – "дух-спутнік".

Чалавек, па Ластоўскаму, у час яго нараджэння прыходзіць у асяроддзе, якое поўніцца варожасцю, непрыхільнасцю суб'ектаў яго да гэтага новага

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

аб'екта адносін у замкнёнай прасторы. Усё, як нейкія чорныя сілы, здольна выступаць супраць з'яўлення патэнцыяльнага змагара з неўладкаванасцю і дысгармоніяй у свеце. Чалавек першапачаткова кінуты на мукі. Але якім будзе яго шлях: сапраўды пакутлівым ці шчаслівым, залежыць ужо і ад чалавека, і ад Долі, якую яму даў Кон. Доля ў дадзеным выпадку – магчымасць альбо немагчымасць здзяйснення важнага і жаданага ў жыцці чалавека, магчымасць альбо немагчымасць доказу асобы Вышэйшай Сіле свайго права на атрыманне наканаванага ёй ідэалу.

Доля – “дух-спутнік” чалавека – сярод наканаванай яму пуціны, поўнай заломаў і звалаў”, “шэрага туману”, “перашкодаў і калючак, грэху і пакуты” (75), вызначае сцежку, якая можа прывесці да агнёў: “блудных і простых праваднікоў жыцця”, якія будуць “то разгарацца, то гаснуць” (76). Доля прапаноўвае чалавеку лавіць гэтыя агні жыцця. Такім чынам, набліжэнне альбо аддаленне ад ідэалу для асобы залежыць ад таго, наколькі годна яна пройдзе тыя перашкоды, якія ёй наканаваны звыш.

Апавяданні В.Ластоўскага “Нарадзіны”, “Мары” і інш. утрымліваюць у сабе патэнцыяльныя сэнсавыя магчымасці да зліцця з літаратурным філасофскім рухам, сутнасцю якога з'яўляецца высвятленне пытання аб ступені суадноснасці аб'ектыўна і суб'ектыўна магчымага ў жыцці асобы. Для апавяданняў В.Ластоўскага адным з істотных момантаў у гэтым сэнсе з'яўляецца гіпатэтычнае мастацкае адлюстраванне суадноснасці паміж прадвызначанай для чалавека магчымасцю пазнання свету і сябе ў ім і рэальнаю доляю гэтага і адпаведна – магчымасці рэалізацыі сваіх намераў.

Свядомасць лірычнага героя В.Ластоўскага поўніцца знаходкамі, якія не даюць ёй супакою, вядуць яе да трагічных вывадаў і асэнсаванняў. Найбольш выразна, шчымліва і безвыходна такое асэнсаванне ў метафарычнай іншасказальнай форме прадстаўлена ў апавяданні “Мары”. Душа лірычнага героя знаходзіцца ў стане разгубленасці і расчаравання. Ён няздольны далей жыць, калі “як звон разбіты ляжыць душа на крушні стройнага гмаху, на пабітых мурах, з каторых калісьці дух каваў красу і дзіў” (80). Пазней Я.Купала сфармуляваў такі стан у сэнсавай плыні *рамантычнай іроніі* даволі адназначна: “Днём з агнём не задумай ты праўду знайсці, / Паспытаць, што за смак гэтай праўды, – / Бо што зробіш, як знойдзеш, ты з ёй у жыцці? / Сам спужаешся гэтакай знайды!”[2].

Нягледзячы на тое, што Кон не з'яўляецца хрысціянскім сімвалам, у *апавяданнях* “*Нарадзіны*”, “Мары” В.Ластоўскага назіраем частковае сэнсавае перакрыжаванне з біблейскімі маральна-філасофскімі тлумачэннямі, пададзенымі ў сувязі з боганатхнёным узнаўленнем жыцця шматпакутнага Іова. “Так, не з пылу выходзіць гора, і не з зямлі вырастае бяда. / Але чалавек нараджаецца на пакуты, каб, як іскры, рынуцца ўверх”[3] (пераклад з рускай мой. – А.М.).

Душэўныя пакуты для лірычнага героя В.Ластоўскага – гэта вынік асэнсавання яго суаднесенасці з сацыяльным асяроддзем і наканаванасцю. Яму не хапае сіл дасягнуць ідэальных формаў жыцця як ухвалы і ўзнагароды за цярпенне і імклівасць да ідэалу ў наканаваным пакутным жыцці. І гэта яго адрознівае ад біблейскага Іова.

У апавяданнях “Нарадзіны” і “Мары” В.Ластоўскі як бы яднае ранейшае і пазнейшае духоўнае вучэнне аб светаўладкаванні і месцы чалавека ў ім. Смерць тут не ёсць перспектыўным збавеннем ад зямных нягод, яна не дазволіць чалавеку трапіць у язычніцкі вырай. Адсюль і напаткаўшыя чалавека нягоды ўспрымаюцца ім як падвойная найвялікшая пакута, ад якой няма збавення нават у смерці: яна для лірычнага героя – “прах і чэзната” (81).

Асабліва ярка гэта прысутнічае ў апавяданні “Мары”, прысвечаным С.Палуяну (твор быў апублікаваны праз месяц пасля смерці дзевятнаццацігадовага пісьменніка). Гэты твор, як і купалаў верш “Памяці С.Палуяна”, з'яўляецца літаратурным помнікам заўчасна пайшоўшаму з жыцця таленавітаму пісьменніку, крытыку, гісторыку літаратуры – асобе, чый талент так і не разгарнуўся ва ўсю наканаваную яму моц. У творы праз іншасказальную

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

форму прасочваюцца прычыны самагубства С.Палуяна, якому “не стала сіл змагацца з блудам векавым, змагацца з доляю няшчаснай” (Я.Купала)[4].

Апавяданне “Мары”, нягледзячы на пазнейшы перыяд яго напісання, прымыкае па сэнсу да апавядання “Нарадзіны” і мае тэндэнцыю да яднання з ім у філасофскае адзінства.

“Воля спрадвечнага Кону” (81) прадвызначыла прысутнасць у свеце прыгожага і непрыгожага, цудоўнага і агіднага, суладдзя і бязладдзя, гармоніі і дысгармоніі. Для чалавека ад самага яго нараджэння шлях да прыгожых формаў азмрочаны: па-першае, ён народжаны сярод болю і разладу (“Нарадзіны”), якія кладуцца трагічным адбіткам на яго лёс; па-другое, да прыгожых формаў чалавеку дабрацца вельмі цяжка: у адных выпадках на шляху да іх ляжаць “перашкоды і калючкі, грэх і пакута” (75) (“Нарадзіны”), у другіх жа прыгожыя формы (ідэал) з’яўляюцца наогул цяжкадасягальнымі: яны – уверсе, наблізіцца да іх можна толькі свядомасцю, толькі душой, толькі выпакутаванымі ў свядомасці вывадамі ў прыгожай форме (”Мары”). Вось гэты другі шлях набліжэння да ідэалу і асэнсоўваецца лірычным героем апавядання ў выніку разумення ім, што ідэал чалавечых адносін як адна з умоў сусветнай гармоніі, прапанаваны Конам на перспектыву, а затым створаны думкаю, свядомасцю чалавека, у рэальных умовах недасягальны, нерэальны. Ён знаходзіцца над будзённасцю, якая магнітам прыцягвае кожнага асобнага чалавека да сябе, каб не даць яму ўзняцца да вышыні ідэалу. Гэтая рэальнасць поўніцца маркотаю, нядоляй, нечысцю, слязьмі, рабствам, і, самае страшнае, зменаю божаstваў. “Там брат крыўдзіць брата” (78). Можна прывесці іншы прыклад з больш позняга па часе напісання твора В.Ластоўскага: “брат няволіць брата, раб багоміць ката” (“Пішы” – 222). І тут ужо не “песня плача”, а сама дысгарманічная ў сацыяльных і інтэлектуальных адносінах рэчаіснасць, плача дух эпохі.

Вобраз лірычнага героя з апавядання “Мары” – гэта не толькі іншасказальнае літаратурна-філасофскае ўзнаўленне духоўнай постаці С.Палуяна, гэта абагульнены вобраз рамантычнага героя-праўдашукальніка, гатовага ахвяраваць сабою дзеля набліжэння іншага чалавека да ідэалу.

Душа лірычнага героя імкнецца да вышыні, да ідэалу, бо толькі там ён зможа наблізіцца да найвышэйшай самарэалізацыі, бо тут, унізе, – рабства, “упёрты ў зямлю погляд пудзіцца шыры, бязмераў”. А гэтай шыры якраз і не хапае лірычнаму герою, не хапае іншым людзям як адной з умоў дасягнення найвышэйшай прыгажосці. Лірычны герой, патэнцыяльна здольны выпакутаваць, выпесціць думку-ідэю, узгадаваць яе “крывёю свайго сэрца”, каб узбагаціць панячце ідэалу, каб, ускарміўшы гэтаю пакутаю арла з ідэальнай вышыні, пусціць яго лётаць у свеце і нагадваць, што ідэал існуе. Па-за кантэкстуальна лірычны герой прадчувае, што такі боль і такі перспектыўны шлях акажацца трагічным для яго, і ён, зазірнуўшы ў будучае, прыходзіць да высновы: “Арлы сіротамі плаваюць у бязмеры, вольныя арлы...” (79).

У дадзеным выпадку можна сцвярджаць, што В.Ластоўскі, як і М.Гарэцкі, сваёй інтэлектуальнай прозай набліжаецца да філасофскага руху XX ст.: новага падыходу да тлумачэння адносін чалавека і біясферы, чалавека і Космасу. Індывід мусіць асэнсаваць, што ён – частка Сусвету, а, значыць, мусіць несці ў прастору станоўчы імпульс сваёй душы, бо сукупнасць адмоўных рыс вядзе да сэнсавай (у адносінах да існавання чалавека) дысгармоніі.

Сіроты-арлы – гэта патэнцыяльныя будзіцелі думкі і свядомасці кожнага асобнага чалавека і грамадства ў цэлым, гэта ідэі высокаарганізаванага інтэлекту, якія прысутнічаюць не толькі ў матэрыялізаванай форме, але і ў прасторы – яны нябачныя і нечуваныя для сляпога і глухога. Але становяцца відавочнымі для чалавека, які жадае бачыць, з’яўляюцца выразнымі ў слыхавых адносінах для таго, хто жадае чуць. Гэтыя арлы здольныя ўзносіць чалавека ў горы, нябачныя і цяжкадаступныя з зямной звыклай раўніны, – да ідэалу.

У апавяданнях В.Ластоўскага філасофскага зместу выкарыстоўваюцца пейзажныя апісанні і замалёўкі як часткі незамкнёнай прасторы свету, якая

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

здольная надзвычай выразна адбіваць праз свой вонкавы стан (на аснове падабенства) унутраную сутнасць міжчалавечых узаемасувязей, адносін Свету да чалавека і наадварот. У гэтым прасочваецца падабенства з элементамі анімізму і аўтарскай сістэмай антрапамарфізму, якія прысутнічаюць у “Казках жыцця” Я.Коласа.

Мастацкі вобраз у апавяданнях В.Ластоўскага мае розныя будову і прынцыпы эстэтычнай арганізацыі. Прасочым гэта на прыкладзе апавяданняў “Нарадзіны”, “Слёзы”, “Ёсць боль”, “Мары”, “Апаўшае лісце”.

**Першае**. Слова, яго форма ствараюць не толькі прыватны мастацкі вобраз, але і агульны ў дачыненні да асноўнай праблемы, якая адлюстроўваецца і вырашаецца ў творы. Слова ў пэўным кантэксце здольна выконваць двайную сэнсавую функцыю.

Так, напрыклад, памяншальная форма назоўніка *дарога–дарожка* (уступ да першай часткі апавядання “Мары”) спрыяе стварэнню вобраза вузкай прасторы, па якой сярод перашкодаў (цемнаты, прыроднай маркоты, віхураў) усё ж рухаецца чалавек. Да назоўніка *дарожка* аўтар далучае эпітэт *вузкая,* які ў дадзеным кантэксце, на першы погляд, спрыяе сэнсавай таўталогіі. Аднак жа гэты эпітэт мае патэнцыяльную праекцыю на ўвесь ідэйны сэнс апавядання: дарога да ідэалу не можа быць шырокай і мнагалюднай, яна абсалютна вузкая дарожка, якую здольны знайсці нямногія і прайсці па якой могуць толькі адзінкі; такі эпітэт падкрэслівае тут сэнсавую абсалютнасць мастацкага вобраза. У далейшым аўтар канкрэтызуе: гэтая дарожка ў горы “*цесна, заломна*”. Адсюль можна зразумець наступнае прызнанне лірычнага героя: “Ідзеш, ідзеш, а сілы млеюць...” (78) і спраецыраваць яго на ўсю фактуальнасць твора і прысвячэнне ў пачатку яго.

Іншыя прыклады: *сцяжынка* (у адносінах да разгледжанага вобраза *дарожкі*); *велікалюды* – духоўныя і фізічныя волаты з мінулага; *арлы* – ідэі, думкі, вобразы; “момант *упадку* майго”, “момант *бяссілля*” – выдзеленыя назоўнікі падкрэсліваюць той стан лірычнага героя, пры якім яго “дух ламаецца”; “павуковая *пража*” – тут не проста павуціна, якой укрылася зіма толькі на пэўны адрэзак часу, а менавіта пража, якой няма канца, якая пляцецца і пляцецца нябачным павуком; *зімка* – спрадвечнасць інтэлектуальнага і сацыяльнага дыскамфорту для чалавека; далей аўтар падкрэсліць гэта ўжо спалучэннем слоў: *зімка-бабулька старая; кумачкі родныя* – ночка з зімой – тут робіцца акцэнт на паяднанасць знешняй неўладкаванасці для чалавека і змрочных ад гэтага яго думак; *сцены* – межы свядомасці; *хатка* – сама свядомасць і інш. – “Мары”.

**Другое**. Значную выяўленча-сэнсавую ролю выконваюць пэўныя спалучэнні лексем: ключавое слова з далучаным да яго эпітэтам (*прыспаныя* душы, *замершыя* сэрцы, *абласкаўленыя* рабы і інш.); разгорнуты ў структурных адносінах эпітэт (*даўно забытыя* багі; *прызёмістыя трухлявыя* вёскі; свята *вольнага звера, птушак паветраных*; свята *дзіву ўсякага поўнае, смутку поўнае*); простая метафара (*віхор завывае, сілы млеюць, пагляд пудзіцца, дух ламаецца* і інш.) – “Мары”.

**Трэцяе**. Даволі часта В.Ластоўскі выкарыстоўвае прыём спалучэння метафар у адно сэнсавае мастацкае адзінства; у іх склад могуць уваходзіць: а) эпітэты, б) аднародныя дапаўненні, выказнікі, в) параўнанні: плыве *лебядзіная* песня і будзіць душы *прыспаныя*, будзіць *замершыя* сэрцы; а *ўпёрты ў зямлю* погляд пудзіцца шыры, бязмераў; вецер шыбае ў галінах, плача ў коміне; нягода *асенняя* слязьмі *зімнымі* палье зямлю, палье бор і лес; *нагія пруткія* галіны ў *нямой* жальбе выцягнуцца ў неба; упуд *палахлівы* туліцца ў *цёмным* куточку; упуд *трывожны чорнай* савой пралятае, кажаном-вампірам на грудзі садзіцца ; вецер шыбае ў галінах, плача ў коміне, *як ранены звер;* галава расце, раздапася і не месціцца ў хаце (“Мары”); (дрэвы) вясной асцярожна выглядалі на свет, летам у поўні сіл змагаліся дружна за кожны прамень сонца, каплю расы і волю ў паветры ( “Апаўшае лісце”).



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Такое спалучэнне ў межах пэўнага кантэксту з яго праблематыкай выконвае ролю апасродкаванай сацыяльнай канкрэтызацыі: непасрэдны мастацкі вобраз утрымлівае ў сабе ўласцівасць праекцыі сэнсу яго вонкавых прымет на сацыяльны суб'ект і грамадскія адносіны, якія леглі ў аснову разгорнутай метафары. У гэтым выпадку такога кшталту метафара спрыяе стварэнню ў межах усяго мастацкага твора аб'ёмнага ідэйна-сэнсавага вобразу.

Лісці: *"шэплева, быццам бяззубыя старцы, нечага ціха-ціха жаляцца."* – "Апаўшае лісце". Уведзенае ў метафару параўнанне выконвае не толькі функцыю стварэння двайнога зрокавага, але і двайнога слыхавога вобраза.

Язміны і ружы, якія "зглушыла лаза", *"голыя і сухія галіны свае, быццам калекія рукі, у нямой жальбе падымалі ў неба"* – "Краскі". Тут стварэнню двайнога зрокавага вобраза спрыяе спалучэнне параўнання з эпітэтамі; такая сэнсава шчымлівая сукупнасць у межах разгорнутай метафары, з'яўляецца ў некаторай ступені аўтарскім адкрыццём.

**Чацвёртае**. Разгорнутыя параўнанні ў спалучэнні з эпітэтамі, дастасаванымі да пэўных вызначальных слоў ужо ў межах іншага вобраза, таксама садзейнічаюць сацыяльнаму праецыраванню пейзажных апісанняў.

Гваздзікі: "*тонкія, высокія, бледныя, падобныя яны былі да людзей, прыбітых беднасцю, горам і хваробай*".

Браткі: "*Збітая іх кучка* прыпомніла мне *грамадку вясковых дзяцей, абдзёртых, худых і галодных, што праз паркан заезднага дому ўглядаюцца на багаты панскі папас.*" – "Краскі" – разгорнутыя аб'ёмныя параўнанні.

Лісці: "*як хворыя і зззяблыя людзі* туляцца ў канаўкі" – разгорнутае параўнанне –"Апаўшае лісце".

**Пятае**. Характэрнай стылёвай рысай апавяданняў В.Ластоўскага з'яўляецца стварэнне аб'ёмнага ў сэнсавых адносінах мастацкага вобраза шляхам аб'яднання ў межах сказа ці абзаца розных мастацкіх тропаў: простай і разгорнутай метафары, простых і разгорнутых эпітэтаў і параўнанняў, перыфразаў і інш. Мастацкі вобраз тут не толькі дастасоўваецца да папярэдняга ці наступнага, а яшчэ і ўключае адзін аднаго; у выніку ўтвараецца шматпланавы вобраз, які ў сукупнасці з сабе падобнымі спрыяе ўтварэнню аб'ёмнай сэнсавай карціны ў мастацкім свеце апавядання. Найбольш выразным прыкладам такога спалучэння можа быць другая частка апавядання "Мары". Тут вобразы зімы, ночы, хаты, яе сцен, галавы можна адпаведна атаясамліваць з наступнымі паняццямі рэальнага свету: разлад, адпаведныя індывідуальнаму расчараванню перажыванні, свядомасць чалавека, межы і магчымасці свядомасці асобы, душа і дух чалавека. Тая сукупнасць мастацкіх характарыстык, якая дастасоўваецца да першага акрэсленага раду, надзвычай доказна і аб'ёмна раскрывае ўзаемаадносіны паміж складальнікамі з другога раду. І самае галоўнае тут тое, што рэцыпіент мае магчымасць праз аб'ёмнасць мастацкага вобраза здзейсніць розныя сэнсавыя праекцыі ў бок пашырэння ідэйнага гучання апавядання з улікам поля аўтарскай творчасці.

Формы і спосабы спалучэння выяўленчых мастацкіх сродкаў спрыяюць у дадзеным выпадку стварэнню двухпланавага эстэтычнага пачуцця: а) захаплення ад першапачаткова ўспрынятага мастацкага вобраза, б) эстэтычных перажыванняў у выніку пірамідальнай сэнсавай праекцыі мастацкага вобраза: праекцыі на канкрэтны аб'ект адлюстравання, на яго сэнсавы двайнік, на ўласную (рэцыпіента) асобу, на грамадства ў цэлым.

Філасофская вартасць апавяданняў В.Ластоўскага якраз і заключаецца ў іх эстэтычнай праблематыцы і формах яе адлюстравання і вырашэння.

Адной з істотных асаблівасцей апавяданняў філасофскага зместу з'яўляецца тое, што В.Ластоўскі, як і Я.Колас, асэнсоўвае жыццё чалавека ў цеснай сувязі з прыродным усталяваннем – у прыватнасці і з незамкнёнай прасторай знешняга свету. Чалавек і прырода разглядаюцца ім як паяднанае адзінства, якое мае агульныя законы свайго існавання, а прыватныя вылучаюцца патэнцыяльнай магчымасцю ўплыву на гэтыя агульныя законы. Таму пейзаж ці яго элементы адыгрываюць значную ролю ў мастацкім выяўленні аўтарскай канцэпцыі.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

[1] Ластоўскі В. Выбраныя творы. Мн., 1997. С.75. (У далейшым спасылкі на гэтае выданне даюцца ў тэксце з пазначэннем у дужках нумара старонкі).

[2] Купала Я. Поўны збор твораў: У 9 т. Мн.,1997. Т.4. С.15.

[3] Книга Иова: Р. V. Ст. 6-7 // Библия. М., 1968. С.541.

[4] Купала Я. Поўны збор твораў: У 9 т. Мн., 1996. Т.2. С.130.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова